# РАЗВІЦЦЁ ЗВЯЗНАГА БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ СРОДКАМІ ТЭАТРАЛІЗАВАНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

# DEVELOPMENT OF ZVYAZNAGA BELARUSKAGA MALENNIA DZYATSEY DASHKOLNAGA TO THE AGE OF SRODKAMI TEATRALIZAVANAY DZEYNASTSI

А. А. Каліноўская
A. Kalinouskaya
выхавальнік дашкольнай адукацыі
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
"Вучэбна-педагагічны комплекс Дабравольскі дзяцячы сад-сярэдняя школа"

У артыкуле разглядаецца праблема фарміравання ў дзяцей дашкольнага ўзросту навыкаў беларускага маўлення ва ўмовах білінгвізму (двухмоўя) праз тэатралізаваную дзейнасць. Паказаны сродкі і спосабы развіцця творчых і маўленчых здольнасцей дзяцей, азначае этапы стварэнне прадметна-развіваючага асяроддзя, якое будзе пабуджаць дзяцей групы да актыўнага связнага беларускага маўленння.

The article deals with the problem of fostering preschool children's speaking slills in Belarusian language in conditions of bilingualism (bilingualism) through theatrical activities. The author describesmeans and methods of developing children's creative and speech abilities, outlines main stages of creating an educational environment that will encourage children actively communicate in the Belarusian language.

*Ключавыя словы:* звязнае беларускае маўленне, тэатралізаваная дзейнасць, прадметна-развіваючае асяроддзе.

*Key words:* a coherent Belarusian speech, theatrical activities, subject-development environment.

На сённяшні дзень спецыфічнай сітуацыіяй для Беларусі з'яўляецца тое, што для пераважнай большасці дзяцей асноўнай мовай, мовай, засвоенай ад бацькоў, з'яўляецца руская. У многіх рэгіёнах, асабліва ў гарадах, дзеці пазбаўлены паўнавартаснага беларускамоўнага асяроддзя. Установа дашкольнай адукацыі – першае і самае галоўнае звяно ў агульнай сістэме адукацыі. Авалоданне роднай мовай з'яўляецца адным з галоўныхнабыццёў дзіцяці ў дашкольным

ўзросце. Менавіта таму працэс далучэння да беларускага маўлення неабходна вырашаць ужо ў малодшым дашкольным узросце.

У працэсе работы сутыкаешся з тым, што ў сувязі з недастатковасцю, ці нават адсутнасцю беларускамоўнай практыкі, ў выхаванцаў не сфарміраваны камунікатыўныя якасці маўленчай дзейнасці. Дзеці з цяжкасцю расказваюць пра з'явы свайго жыцця, не ўмеюць узаемадзейнічаць адзін з адным у час дыялогу, не могуць пераказваць мастацкія творы.

Раздумваючы над пытаннем аб павышэнні ўзроўню беларускага маўлення дзяцей, мы прыйшлі да высновы, што дапамагчы зможа тэатралізаваная дзейнасць. Чаму менавіта тэатралізаваная дзейнасць? Вядома, што вядучым відам дзейнасці дзяцей ранняга дашкольнага ўзросту з'яўляецца гульня. Гульня – гэта практычна адзіная вобласць, дзе выхаванец можа праявіць ініцыятыву і творчую актыўнасць, яна з'яўляецца магутным стымулам для праяўлення самастойнасці ў галіне мовы. А тэатралізаваная дзейнасць – адзін з самых эфектыўных спосабаў уздзеяння на дзяцей, у якім найбольш поўна і яскрава праяўляецца прынцып навучання – вучыць гуляючы. Тэатралізаваная гульня аказвае вялікі ўплыў на моўнае развіццё дзіцяці, стымулюе актыўнае маўленне за кошт пашырэння слоўнікавага запасу, удасканальвае артыкуляцыйны апарат. Выхаванцы засвойваюць багацце роднай мовы, яе выразныя сродкі. Выкарыстоўваючы выразныя сродкі і інтанацыі, якія адпавядаюць характару герояў і іх учынкаў, дзеці будуць імкнуцца гаварыць выразна, каб іх ўсе разумелі. У тэатралізаванай гульні сфарміруецца дыялагічная, эмацыянальна насычаная гаворка. Дзеці будуць лепш засвойваць змест твора, логіку і паслядоўнасць падзей, іх развіццё і прычынную абумоўленасць. Тэатралізаваныя гульні спрыяюць засваенню элементаў маўленчых зносін (міміка, жэст, пастава, інтанацыя, мадуляцыя голасу).

У сваіх гульнях дзеці пачынаюць выкарыстоўваць літаратурныя сюжэты, забаўлянкі, казкі, фантазіруюць, прыдумваюць свае ўласныя сюжэты. Гэта з'яўляецца ключавым імпульсам эфектыўнага засваення беларускага маўлення, той дзейнасці, якая з'яўляецца, з аднаго боку, абавязковай, а з другога – даволі цяжкай для дзяцей.

Таму былі вызначаны наступныя задачы: прааналізаваць навукова-метадычную літаратуру, сучасныя тэарэтычныя даследаванні па праблеме развіцця звязнага беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту; стварыць прадметна-развіваючае асяроддзе, якое будзе пабуджаць дзяцей групы да актыўнага беларускага маўленчага развіцця праз тэатралізаваную дзейнасць; распрацаваць канспекты заняткаў, творчых праектаў, гульнявых практыкаванняў па развіцці

беларускага маўлення і маўленчых зносін дзяцей; укараніць ў практыку сваёй работы эфектыўныя формы і метады работы для фарміравання ўстойлівай цікавасці і станоўчых адносін да беларускай мовы; пашырыць веды бацькоў па праблеме развіцця звязнага беларускага маўлення дзяцей. Рашэнне гэтых задач спрыяла стварэнню цэнтра тэатралізаванай дзейнасці. Асноўны прынцып яго работы – паслядоўнасць і сістэмнасць, а у навучанні дзяцей – актыўныя формы і метады работы, якія даступныя дзецям і з’яўляюцца эфектыўнымі.

Работа па папаўненні центра тэатралізаванай дзейнасці метадычным абсталяваннем прыдугледжвала абнаўленне матэрыялу. Былі распрацаваны: праект “Праз тэатр да роднай мовы” па далучэнні дзяцей да беларускай мовы; практыкаванні па дыхальнай гімнастыцы, чыстагаворкі, скарагаворкі; канспекты заняткаў з элементамі тэатралізаванай дзейнасці; кансультацыі для бацькоў; майстар-класы для выхавальнікаў. У выніку працы цэнтр тэатралізаванай дзейнасці ў групе прадстаўлены разнастайным абсталяваннем для разыгрывання сцэнак і спектакляў; наборы лялек, шырмы для лялечнага тэатра, касцюмы, маскі, тэатральныя атрыбуты; разнастайныя віды тэатраў (лялечны, тэатр лапатак, пальчыкавы, тэатр на прышчэпках); элементы касцюмаў для рэжысёрскіх гульняў, гульняў-драматызацый, а таксама матэрыял для іх вырабу.

Асобую цікавасць выклікала рэалізацыя творчага праекта “Праз тэатр да роднай мовы”. На наш погляд, развіццю творчага маўлення, фарміраванню ўзаемадапамогі, партнёрства, пераадоленню сарамлівасці садзейнічае работа над пастаноўкай спектакля або казкі менавіта на беларускай мове. Тэатр як форма творчай дзейнасці стварае вельмі добрыя ўмовы для маўлення дзяцей: прагаворванне маналогаў, дыялогаў, імправізацыі. Пры гэтым вырашаюцца многія задачы: правільнае гукавае вымаўленне, узбагачэнне слоўніка дзіцяці, знаёмства з беларускім фальклорам, і самае галоўнае – мімавольнае беларускае маўленне. Тэатралізаваная дзейнасць была арганізавана ў ранішні і вячэрні час, а таксама запланавана ў спецыяльна арганізаванай дзейнасці. Заняткі праводзіліся невялікімі падгрупамі, што забяспечыла індывідуальны падыход да кожнага дзіцяці. Пры гэтым кожны раз падгрупы фарміраваліся па-рознаму, у залежнасці ад зместу дзейнасці. З самага пачатку азнаямлення дзяцей з мастацкімі творамі імкнуліся навучаць іх уважліва слухаць, пазнаваць і, па магчымасці, запамінаць беларускія словы. У час азнаямлення з творамі вялікую ўвагу надавала свайму выразнаму чытанню, паўзам, міміцы.

Некаторыя атрыбуты для тэатралізаванай дзейнасці можна купіць, але мы аддаём перавагу вырабам сваімі рукамі. У гэтым выпадку з’яўляецца магчымаць

далучыць бацькоў і дзяцей да ўдзелу ў рэалізацыі праекта. Бацькі і дзеці ахвотна стваралі тэатральную атрыбутыку, што стымулявала іх жаданне ўдзельнічаць у драматызацыі. Так быў зроблены сваімі рукамі казачны герой Дзед-Барадзед.

Вялікую ролю ў рабоце з дзецьмі адыгрывае цеснае супрацоўніцтва з бацькамі выхаванцаў. Пасля правядзення анкетавання “Моўнае развіццё вашага дзіцяці” быў зроблены вынік, што бацькі маюць не зусім правільныя ўяўленні аб тым, як важна развіваць беларускае маўленне дзяцей дашкольнага ўзросту. Многім бацькам патрэбна педагагічная дапамога па развіцці ў дзіцяці звязнага маўлення і папаўнення слоўнікавага запасу беларускімі словамі. З мэтай пашырэння ўяўленняў бацькоў аб фарміраванні ў дзяцей дыялагічнага і маналагічнага маўлення як сродка зносін былі праведзены кансультацыі і інтэрактыўная гульня “Правільнае маўленне – залог творчай індывідуальнасці”, “Праз тэатр да роднай мовы”, “Свята роднай мовы”.

Работа праводзілася ў цесным кантакце з педагагічнымі работнікамі установы дашкольнай адукацыі, а таксама музычным кіраўніком. Супрацоўніцтва з педагогамі ажыцяўлялася праз наступныя формы работы: кансультацыі, круглыя сталы, дыскусіі, адкрытыя заняткі, майстар-класы, метадычныя аб’яднанні.

У сістэме працы над развіццём беларускага маўлення выхаванцаў мы абапіраліся на новыя формы і метады работы, у прыватнасці, выкарыстоўвалі метады і прыёмы мнематэхнікі. Гэта дазволіла вырашаць многія задачы: правільнае гукавае вымаўленне, узбагачэнне слоўніка дзіцяці, знаёмства з беларускім фальклорам, і самае галоўнае – мімавольнае беларускае маўленне.

У выніку сістэмнай творчай работы:

– стварaны “Цэнтр тэатралізаванай дзейнасці”, прадметна-развіваючае асяроддзе, пабуджаючае выхаванцаў да актыўнага моўнага развіцця праз тэатралізаваную дзейнасць;

– створаны тэатралізаваны гурток “У гасцях у казкі”;

– рэалізаваны творчы праект “Праз тэатр да роднай мовы”;

– створана і аформлена картатэка метадычных матэрыялаў;

– пашыраны веды бацькоў па дадзенай тэме, разпрацаваны рэкамендацыі, памяткі па далучэнні дзяцей да беларускага маўлення;

– створаны клуб для бацькоў “Залаты ключык”.

Прывіццё любові да сваёй маленькай Радзімы, таго напрыгажэйшага куточка, дзе нарадзіўся, вырас, атрымаў першыя жыццёвыя ўрокі, пачынаецца менавіта з дзяцінства. Кожны чалавек, у тым ліку і маленькі грамадзянін, павінен

ведаць родную мову, культурную спадчыну свайго народа, бо гэта нашы карані, нашы вытокі.

## *Список использованных источников*


1. Старжынская, Н. С. Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў ад 4 да 7 гадоў : вучэб.-метад. дапам. для педагогаў ўстаноў дашк. адукацыі з рус. мовай навучання / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна. – Мінск : Аверсэв, 2017. – 183 с.
2. Старжынская, Н. С. Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў: вучэб. дапам, / Н. С. Старжынская. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 223 с.